■ Рэгіёны

# МОЙ ПАШТАЛЬЁН

## Чым жыве аддзяленне сувязі ў глыбінцы

**«Раённых паштальёнаў ведаюць у твар. Людзі прывыкаюць да нас. Калі хтосьці з работнікаў ідзе ў водпуск, пачынаюць пытаць: «А дзе мой паштальён? Я падпіску толькі ў яго буду афармляць», — расказвае начальнік аддзялення сувязі Дуброўна-1 Аршанскага раённага вузла паштовай сувязі Алена КУСКОВА.**

Пад яе кіраўніцтвам працуе чатыры аператары сувязі, дзевяць паштальёнаў (шэсць гарадскіх і тры сельскія) і аператар мотадаўкі (аб'язджае на машыне сельскую мясцовасць). Зона абслугоўвання — горад Дуброўна і шэсць вёсак у ваколіцах.

— Разносім лісты, дапамогі, пенсіі. Самыя запатрабаваныя паслугі — страхаванне (напрыклад, транспарту), аплата «камуналкі», адпраўка і выдача пасылак. А цяпер перад Новым годам заказваюць яшчэ і віншаванні ад Дзеда Мароза, — дзеліцца Алена Кускова.



Аператар сувязі Вольга СІМАНЬКОВА ўзважвае пасылку.

Паштовая інтэрнэт-крама, дзе прадаюцца тавары беларускіх вытворцаў, у раёне пакуль толькі набывае папулярнасць. Дубровенцы прыглядаюцца да новага сэрвісу, апрабоўваюць: заказваюць дываны, мехавыя тапачкі.

У самім аддзяленні прадаюцца прадукты і тавары паўсядзённага попыту. Можна папрасіць прывезці неабходную рэч пад заказ. Сярод пенсіянераў, напрыклад, хадавы тавар — камбікорм для курэй.

Пяць гадоў таму на дубровенскай пошце з'явіўся плацежна-даведачны тэрмінал. Спачатку яго абыходзілі бокам, а цяпер актыўна карыстаюцца, асабліва тыя, хто разлічваецца па картцы. Збольшага тэрмінал запатрабаваны, вядома, у моладзі, але і людзі пажылога ўзросту цікавяцца. Нават самастойна спрабуюць асвойваць тэхналогію.



Начальнік аддзялення Дуброўна-1 Алена КУСКОВА.

Алена Кускова, дарэчы, на пошце працуе ўжо 18 гадоў. Пачынала аператарам сувязі, а апошнія чатыры гады — за начальніка. Практычна ўсе ў калектыве працуюць у аддзяленні больш за 10—15 гадоў.

— Уладкоўваецца да нас і моладзь. Спачатку дзяўчатам было цяжка, але потым падцягнуліся. Гледзячы на вопытных работнікаў, сталі іх даганяць і цяпер на роўных. Гэта толькі здаецца, што прафесія паштальёна лёгкая. Тут жа трэба і на работу раней прыйсці, і ўмець выслухаць, і вучыцца прадаваць. Ёсць бабулі, з якімі трэба спачатку пагутарыць, а потым яны гатовы і газету выпісаць, і тавар купіць. Увогуле, пенсіянеры задаволены нашымі работнікамі, — адзначае Алена Кускова.

Каб падтрымліваць цікавасць да сваіх паслуг, у аддзяленні ледзь не кожны тыдзень праводзяцца розныя акцыі — дзень посткросінгу, кірмашы паштовак. Работнікі ходзяць у дзіцячыя садкі і школы, расказваюць дзецям пра пошту — так бы мовіць, выхоўваюць кліентаў змалку.

*г. Дуброўна*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пісьмы прымае аператар сувязі Ларыса ДРАЗДОВА.

■ Для самых-самых

# ПАДПІШЫ НА ГАЗЕТУ — ВЫЙГРАЙ ПРЫЗ

## «Звязда» праводзіць «грашовыя» конкурсы

**Разыгрываць прызы сярод падпісчыкаў ужо стала добрай «звяздоўскай» традыцыяй. Але хочацца парадаваць і тых, дзякуючы каму газета штодня даходзіць да чытача. А менавіта паштальёнаў. Каб адзначыць самых актыўных і адданых з іх, «Звязда» запускае некалькі конкурсаў.**

Адзін з іх — **«Прыз — рупліваму паштальёну».** Удзельнік павінен падпісаць на «Звязду» максімальную колькасць людзей (ці арганізацый) на першы квартал або першае паўгоддзе 2018 года. Пры гэтым рост колькасці падпісчыкаў мусіць складаць не менш як 10 чалавек у параўнанні з пагадзіцельнікам на 1 студзеня 2017-га. Грашовы прыз — 500 рублёў. Усяго будзе выбрана сем пераможцаў (ад кожнай вобласці і Мінска).

**Да ўдзелу ў конкурсе на найлепшага арганізатара падпіскі запрашаюцца кіраўнікі вузлоў сувязі і вытворчасці «Мінская пошта».** Каб пазмагацца за галоўны прыз, трэба забяспечыць на першага студзеня наступнага года аднаўленне тыражу нашай газеты ў сябе на месяцы на 100 працэнтаў і больш у параўнанні з тыражом на гэтым жа вузле на 1 студзеня 2017-га. Кожны, хто выканае ўмовы, атрымае 200 рублёў. Калі тыраж па раёне аднавіўся больш чым на 100 працэнтаў (і пры гэтым вырас не менш як на 10 экзэмпляраў), пасля паказчыка 101% за кожны дадатковы працэнт сума ўзнагароды павялічваецца на пяць рублёў.

**Прыз будзе разыгрывацца і сярод найлепшых грамадскіх распаўсюджвальнікаў.** Для гэтага неабходна падпісаць на «Звязду» максімальную колькасць людзей на першы квартал ці першае паўгоддзе наступнага года. Пры гэтым агульная колькасць падпісчыкаў не павінна быць ніжэйшай за 10 чалавек. Ад кожнай вобласці і Мінска выберуць па адным пераможцы, якія атрымаюць па 100 рублёў.

Для правядзення розыгрышу ўсе звесткі кіраўнікі аддзяленняў сувязі і раённых вузлоў павінны накіраваць у РУП «Белпошта» (упраўленне распаўсюджвання друкаваных СМІ) да 25 студзеня 2018 года. На канверце трэба паставіць адпаведную пазнаку — «Конкурс «Прыз — рупліваму паштальёну / найлепшым арганізатарам падпіскі / найлепшым грамадскім распаўсюджвальнікам».

**Розыгрыш прызоў адбудзецца 9 лютага** ў 12 гадзін у рэдакцыі «Звязды» па адрасе **вуліца Б. Хмяльніцкага, 10А.** Даведкі, якія датычацца конкурсаў, можна атрымаць **па тэлефоне (017) 337 44 04.**

Усім удзельнікам жадаем удачы, лёгкасці ў нагах і бясконцага абаяння!

■ На свае вочы

# 200 ТЫСЯЧ ЛІСТОЎ У СУТКІ

## Як сартуюць карэспандэнцыю для ўсёй краіны

**Яшчэ пяць гадоў таму лісты на пошце сартавалі ўручную. Работнікі цэха на памяць ведалі ўсе індэксы, хутка расцягвалі пісьмы па ячэйках і заўсёды былі ў курсе, якія вуліцы нядаўна перайменавалі. Каля 200 чалавек шчыравала ў дзве змены, каб віншаванні, дакументы і прызнанні ў каханні даходзілі да адрасатаў. Цяпер жа карэспандэнцыя сартуецца аўтаматычна. Каб паглядзець, як гэта адбываецца, мы накіраваліся ў экскурсію на вытворчасць «Мінская пошта», куды дастаўляюцца лісты з усёй краіны.**

### РАЗУМНЫЯ МАШЫНЫ І «МОСЬКА»

Падымаемся ў цэх пісьмовай карэспандэнцыі. Сартавальнае абсталяванне з'явілася тут у 2012 годзе. Тры машыны за дзень апрацоўваюць больш за 200 тысяч лістоў. Для абслугоўвання кожнай з іх дастаткова двух чалавек (ці трох, калі вялікая нагрузка).

Канверты ў цэх «прыязджаюць» на грузавых ліфтах. Работнікі пошты складваюць лісты ў стосы і загружаюць у машыны. Сюды ж трапляюць і паштоўкі для посткросінгу. Далей — справа за тэхнікай. Яна распазнае адрасы, размяркоўвае канверты спачатку па раёнах, а потым — па аддзяленнях сувязі ажно да сумкі паштальёна (чатыры лічбы, якія ставяцца пасля індэксу, абазначаюць зону абслугоўвання канкрэтнага работніка). Машына можа таксама праставіць віншаванні да тэматычных свят — Новага года, 8 Сакавіка, Дня маці.

Далей карэспандэнцыю перакладваюць у асобныя кантэйнеры. Перавязаць стос лістоў за некалькі секундаў дапамагае «моська» — так ласкава называюць пачкавязальную машыну MOSCA. Націснуў на педальку — і гатова.




— Напрацавана добрая адрасная база — дзякуючы ёй у нас вялікі працэнт механічнай сарціроўкі, — расказвае **начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Наталля ПІЛЕЦКАЯ.** — Усе новыя адрасы адразу заносім у даведнік, таму перайменаванне населеных пунктаў для сартавальнай машыны не складае праблемы. Нават калі чалавек пазначыць на канверце старую назву вуліцы, сістэма зробіць замену. Пытанні могуць узнікнуць, калі вуліца з пэўнай назвай, напрыклад Матусевіча, была перанесена. Але тут знайсці адрасата дапаможа паштовы індэкс.

Машына разумее амаль любы почырк і ўмее распазнаваць рускую, беларускую і англійскую мовы. Калі ўзнікаюць спрэчныя моманты, лісты адпраўляюцца на відэакадзіраванне, дзе адрасы чытаюць ужо непасрэдна работнікі. І даволі хутка: за гадзіну кожны з іх апрацоўвае па 295 лістоў.

Не ўсе адпраўнікі падпісваюць канверты правільна. Напрыклад, пазначаюць «Мінск, суду Першамайскага раёна», а адрас не падаюць. Такая карэспандэнцыя з разраду «на вёску дзядулі», вядома, дойдзе, але для таго, каб яе апрацаваць, спатрэбіцца больш часу.

Бывае, у канверты кладуць асадкі, хэнд-мэйд-вырабы і іншыя рэчы, якія нельга адпраўляць у пісьмах.

### ЛІСТАВАННЕ З ДУШОЙ

За мінулы год праз цэх прайшло каля 58 мільёнаў лістоў. Асноўную частку складае дзелавая карэспандэнцыя. Рассылаецца шмат часопісаў, рэкламных каталогаў. Доля лістоў з іншых краін нязначная — у асноўным пішуць з блізкага замежжа.

У перадназаваднюю пару, бадай, галоўным адрасатам становіцца Дзед Мароз. Яму адпраўляюць па 500 лістоў у дзень! Дзеці добра ведаюць, дзе знаходзіцца рэзідэнцыя чараўніка. Але, запэўніваюць нас, нават калі ліст будзе аформлены з памылкай, яго ўсё роўна перашлюць Дзеду Марозу.



Кожная паштовая скрыня на вуліцы знаходзіцца пад кантролем. Калі кур'ер забірае карэспандэнцыю, спрацоўвае чып, і на прадпрыемстве ведаюць, у колькі было зроблена выманне.

А за шляхам заказных лістоў можна прасачыць самому. Калі вы адпраўляеце такі ліст, выдаюць квітанцыю з нумарам (ён складаецца з 13 сімвалаў). Яго трэба ўвесці на сайце Белпошты ў раздзеле «Сачэнне за паштовымі адпраўленнямі», і сістэма пакажа, на якім этапе ваш ліст.

Дарэчы, пошта можа дапамагчы не толькі даставіць, але і скласці ліст. Праз інтэрнэт-сэрвіс выбіраеце паштоўку, прыдумваеце віншаванне, а прадпрыемства за вас афармляе ўсё ў папяровым выглядзе і адпраўляе адрасату.

Для бізнесу прапануецца паслуга гібрыднай пошты.

— Мы атрымліваем лісты ад арганізацый у электронным выглядзе, раздрукоўваем іх, раскладваем па канвертах і рассылаем, — тлумачыць прынцып паслугі начальнік вытворчасці. — У нас ёсць буйныя кліенты — банкі, падатковыя органы, сотавыя аператары. Многія арганізацыі спрабуюць рабіць такую рассылку самастойна, але для гэтага трэба наймаць людзей, купляць дадатковыя прынтары. А праз пошту ўсё роўна атрымліваецца больш хутка і якасна.

На думку начальніка вытворчасці, хоць аб'ём пісьмовай карэспандэнцыі і скарачаецца, ад лістоў у традыцыйным папяровым выглядзе яшчэ не хутка адмовяцца:

— Што датычыцца дзелавой перапіскі, то гэта вельмі зручна, калі ўсе неабходныя дакументы ёсць пад рукой на стале. А наконт звычайных лістоў — у іх, у адрозненне ад электронных, ёсць душа. Гэта добры спосаб праявіць увагу, паказаць, што ты памятаеш пра чалавека.

Выпуск падрыхтавала Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by